# Машыны вывучаць беларускую мову?

**У Мінску адбыўся семінар па праблемах бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў па зроку. Гэта новы напрамак дзейнасці для Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь — такія спецыялізаваныя бібліятэкі раней знаходзіліся пад патранатам грамадскага аб'яднання БелТІЗ. З 2006 года іх паступова пачалі перадаваць на баланс упраўленняў культуры. Цяпер яны знаходзяцца ў сетцы публічных бібліятэк.**

На семінары прысутнічалі прадстаўнікі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскага аб'яднання БелТІЗ, Міністэрства працы і сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, бібліятэкары, прадстаўнікі выдавецтваў і паліграфічных прадпрыемстваў краіны.

Падчас зацікаўленай размовы былі прадэманстраваны сучасныя выданні для інвалідаў па зроку і тэхнічныя магчымасці для далучэння людзей, якія слаба бачаць, да багатай духоўнай спадчыны. Амаль фантастычнае па сённяшнім часе абсталяванне, якое прадастаўляе неабмежаваныя магчымасці доступу да інфармацыі, маецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Машыну са сканерам, якая дапамагае ў працы, ўжо назвалі "Кнігалюб". Прынцып яе дзей-

насці надзіва простыя: скапіруецца тэкст, і старонкі кнігі выводзяцца на экран-дысплей. Тэкст можна павялічваць да 72 разоў. Калі ў чалавека дрэнны зрок, пры такім павелічэнні, натуральна, літары і словы ён зможа прачытаць. Акрамя таго, машына-камп'ютэр умее чытаць тэксты ўголас: яна распазнае тры мовы: рускую, англійскую і нямецкую. Такім чынам, праз навушнікі можна праслухаць любы літаратурны твор, які вас зацікавіў.

Сучасныя тэхналогіі толькі ўкараняюцца ў жыццё. Машыны нямецкай фірмы, на жаль, не адаптаваныя да беларускай мовы, і вялікі фонд айчынных дакументаў пакуль застаецца недасягальным для чытача з аслабленым зрокам. Але што самае цікавае: наш БДУІР прадставіў сваю распрацоўку па аналагу нямецкага абсталявання. Яна будзе таннейшая і, магчыма, па-сапраўднаму беларуская: зможа, нарэшце, чытаць і беларускамоўныя тэксты.

Зразумела, ад кніг, напісаных і аддрукаваных шрыфтам Брайля, адмаўляцца пакуль нельга, таму што такая літаратура неабходна для вучобы і адукацыі. Асабліва ж незаменныя друкаваныя кнігі, калі патрэбна мець пры сабе навукова-вывераны, дакладны тэкст. Ёсць і кнігі, выдадзеныя ўзбуйненым шрыфтам — яны таксама запатрабаваны. Але відавочна: ва ўсіх буйных бібліятэках, калі адкрыецца такая магчымасць, будуць ствараюцца спецыялізаваныя месцы для абслугоўвання інвалідаў па зроку.

**Ірына ТУЛУПАВА**